УДК 069:728.83:712(476.5)

# КЛАСІФІКАЦЫЯ СЯДЗІБНА-ЛАНДШАФТНЫХ КОМПЛЕКСАЎ НА ТЭРЫТОРЫІ ВІЦЕБСКАЙ ВОБЛАСЦІ: НЕАБХОДНАСЦЬ НОВЫХ ПАДЫХОДАЎ

**Герасімёнак Д. В.**
*Установа адукацыі “Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў”, Мінск*

Працэсы глабалізацыі і хуткага развіцця сродкаў масавай інфармацыі прыводзяць да страты нацыянальнай ідэнтычнасці і самабытнасці народа. Сядзібы ў мінулым з’яўляліся найбольш выразнымі культурнымі і эканамічнымі ўтварэннямі Беларусі і ўключалі палацы і сядзібныя дамы, гаспадарчыя і вытворчыя збудаванні, капліцы, сады, паркі, водныя сістэмы, а таксама малыя архітэктурныя формы. Усе архітэктурныя і ландшафтныя элементы былі аб'яднаны адзінай логікай планіровачнай пабудовы, створаны ў адпаведнасці са стылёвымі прынцыпамі пэўнай эпохі. Сядзіба – гэта менавіта такі аб’ект гісторыка-культурнай спадчыны, дзе найбольш поўна захоўвалася памяць народа, таму і зараз яе вывучэнне спрыяе зберажэнню і далейшаму развіццю беларускай нацыянальнай культуры.

У артыкуле разглядаецца гісторыя развіцця і сучасны стан помнікаў сядзібна-паркавага мастацтва на тэрыторыі Віцебскай вобласці. На падставе аналізу шэрагу класіфікацый помнікаў гісторыка-культурнай спадчыны, якія прапанаваны міжнароднай навуковай супольнасцю, робіцца спроба сістэматызаваць сядзібна-ландшафтныя комплексы рэгіёну для больш шырокага іх уключэння ў актуальную культуру.

Ключавыя словы: музеі-сядзібы, музеефікацыя, актуалізацыя спадчыны.

# CLASSIFICATION OF MANOR AND LANDSCAPE COMPLEXES ON THE TERRITORY OF VITEBSK REGION: NECESSITY FOR NEW APPROACHES

**Gerasimenok D. V.**
*Educational Establishment «Belarusian State University of Culture and Arts», Minsk*

Globalization processes and rapid development of mass media lead to the loss of national identity and originality of the people. Country estates were in the past the most expressive cultural and economic entities of Belarus and included palaces and manor houses, household and industrial buildings, chapels, gardens, parks, water systems and small architectural forms. All architectural and landscape elements were combined into single logic of composition structure, designed in accordance with the stylistic principles of a certain period. A country estate is an object of historical and cultural heritage, which preserved most complete memory of the people; therefore, its study contributes to the preservation and further development of the Belarusian national culture.

The article focuses on the evolution history and current status of landscape gardening and estate building in Vitebsk Region. Considering various classifications of historical and cultural heritage, the author is attempting to systematize the manor and landscape complexes of the Region for their wider inclusion in the current culture.

Key words: estate museums, museumification, actualization of heritage.